**ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ**

# ПЛЁН ПРАЦЫ НАШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

У нашай ВНУ стала добрай традыцыяй праводзіць конкурс на лепшыя навукова-даследчыя работы сярод выкладчыкаў. Сёлетні год не стаў выключэннем. Не так даўно былі падведзены вынікі і вызначаны лаўрэаты.

У намінацыі ***«Лепшая манаграфія года»*** пераможцамі сталі: С.Л. Багамаз, кандыдат псіхалагічных навук, загадчык кафедры прыкладной псіхалогіі; С.У. Лауткіна, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры карэкцыйнай работы; І.У. Мандрык, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі; В.А. Космач, доктар гістарычных навук, дэкан гістарычнага факультэта; С.В. Мядвецкі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва; А.В. Мядвецкі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва.

У намінацыі ***«Лепшы падручнік (вучэбны дапаможнік) года»*** перамаглі: М.М. Падаксёнаў, кандыдат фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры геаметрыі і матэматычнага аналізу; У.І. Каваленка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры дызайну; В.У. Кулянёнак, кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры дызайну; У.П. Быстракоў, кандыдат хімічных навук, дацэнт кафедры хіміі; І.І. Каладоўскі, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва; І.В. Галуза, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры інжынернай фізікі.

У намінацыі ***«Лепшы цыкл артыкулаў года»*** пераможцамі сталі: Ю.М. Бабіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства; А.М. Галкін, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар кафедры геаграфіі; А.Ю. Муратава, кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры агульнага і рускага мовазнаўства; А.А. Лавіцкі, кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры германскай філалогіі; І.А. Саладоўнікаў, кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры заалогіі.

Сярод маладых вучоных у намінацыі ***«Лепшая манаграфія года»*** перамагла Т.А. Талкачова, кандыдат біялагічных навук, выконваючы абавязкі загадчыка кафедры хіміі; у намінацыі ***«Лепшы падручнік (вучэбны дапаможнік) года»*** – Я.Я. Аршанскі, доктар педагагічных навук, прафесар кафедры хіміі; у намінацыі ***«Лепшы цыкл артыкулаў года»*** – Н.В. Кухтова, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры прыкладной псіхалогіі.

**НАШ КАР.**